VII раскоп у церкви Климента, папы Римского 2016 года (П-16-Клим-VII, В-6 (-118)-8, ПГОИАХМЗ, №11). Материал – железо, застежка фигурная с заклепкой. Изготовлена из бронзы, имеет два сквозных отверстия. Девятая – на XI раскопе в Окольном городе 2018 года (П-18-Ог-XI, 2-10 (-195)-21, ПГОИАХМЗ, №17). Изготовлена из бронзы, имеет растительный орнамент. Последняя застежка в археологической документации отмечена как книжная, но нельзя с уверенностью говорить об этом, так как она может являться поясной.

Если переходить к картографии находок, то стоит сказать, что в первой половине XIV в. рукописи в Пскове переписывались для Пантелеймоновского монастыря на Красном дворе, церкви Воскресения Христова в Довмонтове стене, Пантелеймонова Дальнего монастыря, Климентьевского монастыря, церкви Воздвижения Честного креста на Княжем дворе, церкви Рождества Иоанна Предтечи в монастыре Иоанна за рекою, церкви Благовещения Богородицы в Крому, а также, возможно, для монастыря Козьмы и Дамияна на Гремячей горе и церкви Рождества Богородицы в Снетогорском монастыре. Книгописные мастерские XIV в. существовали в церквях Вознесения Христова в Домонтове городе, (1309 или 1310 г.), Николы над Греблей в Домонтове городе (1312–1313, ок. 1330 г.), Воздвижения креста на Красном Дворе в Пскове (1382 г.) [6]. Исходя из анализа карты можно отметить, что наиболее близко к книжным мастерским находятся находки из раскопов: Мирожского монастыря (близко к Климентьевскому монастырю), Климентовский (близко к Климентьевскому монастырю), находки с Лубянского раскопа и с улицы Ленина находятся достаточно близко к княжому двору.

**Заключение.** В ходе данной работы были проанализированы материалы по истории книжной фурнитуры на территории Древней Руси, а также дана характеристика предметов, найденных на территории Пскова. На данный момент найдено 13 предметов книжной фурнитуры, четыре из которых накладки и девять застежек. Самым распространённым материалом для изготовления книжный накладок является бронза (2 экземпляра), за ней – свинцово-оловянистый сплав (1 экземпляр), материал еще одного – неизвестен. Из четырех найденных накладок две угловые, а также три имеют орнамент. Среди 9 книжных застежек наиболее популярный материал тоже бронза (6 экземпляров), за ним – цветной металл (2 экземпляра), потом – железо. Три застежки орнаментированы, и одна является пряжкой от книжной застежки.

1. Щепкин, В. Н. Русская палеография / В. Н. Щепкин. – М.: Аспект Пресс, 1999. – 270 с.
2. Гуревич, Ф. Д. Грамотность горожан древнерусского Понеманья / Ф. Д. Гуревич // КСИА. – 1973. – № 135. – С. 28–34.
3. Пескова, А. А. Писала и книжные застежки из раскопок на большом Шепетовском городище / А. А. Пескова // Археологические вести. – 2021. – № 31. – С. 264–276.
4. Лабутина, И. К. Раскоп 1967 в Окольном городе Пскова / И. К. Лабутина // Археология и история Пскова и Псковской земли. – 1994. – Вып. 2. – С. 6–44
5. Козлова, А. В. Металлические украшения и предметы быта восточной традиции X – XV веков из раскопок в Пскове / А. В. Козлова // Археология и история Пскова и Псковской земли. – 2007. – С. 125-143.
6. Столярова, Л. В. Книга в Древней Руси (XI–XVI вв.) / Л. В. Столярова, С. М. Каштанов. – М.: Русский фонд содействия образованию и науке, 2010. – 448 с.

## АРГАНІЗАЦЫЯ І ДЗЕЙНАСЦЬ САЮЗА ТУРЫСТЫЧНАЙ ПРАПАГАНДЫ Ў НАВАГРАДСКІМ ВАЯВОДСТВЕ (1935 г.)

***Булаты П.Ю.,***
*малады навуковец, БДУФК, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Ключавыя словы. Гісторыя турызму, турыстычныя арганізацыі, міжваенны час, Наваградак.
Keywords. History of tourism, travel organization, interwar period, Navahradak.

У міжваенны час на землях Заходняй Беларусі развіццю разнастайных відаў унутранага турызму надавалася значная ўвага. Пры яго арганізацыі выкарыстоўваліся шматлікія рэгіянальныя турыстычныя рэсурсы. Турыстычная дзейнасць ажыццяўлялася дзяржаўнай адміністрацыяй і грамадскімі аб’яднаннямі на рэгіянальным адміністрацыйным узроўні. Так, пры ваяводскіх урадах дзейнічалі адмысловыя турыстычныя ад-

дзелы, а таксама рэгіянальныя аддзелы турыстычных аб'яднанняў (у прыватнасці, «Саюза турыстычнай прапаганды»). У кантэксце пабудовы гістарычнай пераемнасці ў арганізацыі сучаснай турыстычнай індустрыі, даследаванне структуры і дзейнасці рэгіянальных турыстычных арганізацый мінулых эпох – актуальная задача. Мэта даследавання – ахарактарызаваць асаблівасці арганізацыі і аспекты дзейнасці аддзелу «Саюза турыстычнай прапаганды» ў Наваградскім ваяводстве.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання дзейнасці Саюза турыстычнай прапаганды Наваградскага краю (Związek Propagandy Turystycznej Ziemi Nowogródzkiej) з'яўляецца публіцыстычнае выданне «W Nowogródzkiej Stronie» («У Наваградскім краі»). Абумоўлена гэта тым, што адным з аспектаў дзейнасці турыстычных арганізацый з'яўлялася выдавецкая дзейнасць. Рэгіянальныя аб'яднанні рыхтавалі да друку турыстычныя даведнікі, адмысловыя брашуры і бюлетэні, буклеты, паштоўкі. Інфармацыйна-турыстычны бюлетэнь «У Наваградскім краі», які выходзіў пад патранажам Саюза турыстычнай прапаганды, планаваўся як перыядычнае выданне з частатой выхаду адзін раз на месяц. Першы нумар турыстычнага бюлетэня пабачыў свет у 1934 г. Першыя два нумары выдаваліся саматужна праз капіравальны апарат, але ўжо з 1935 г. выданне друкавалася на павятовай тыпаграфіі. Яно атрымала дзяржаўную падтрымку і актыўна распаўсюджвалася ў 1935 годзе. На старонках выдання змясціліся матэрыялы рознага кшталту, датычныя да турыстычнай тэматыкі: афіцыйныя звесткі, інфармацыйныя нататкі, рэклама, але большую частку займаюць навукова-папулярныя артыкулы, прысвечаныя прывабным турыстычным месцам Наваградскага рэгіёна. Таксама выданне асвятляла дзейнасць свайго заснавальніка – аддзел Саюза турыстычнай прапаганды ў Наваградскім ваяводстве.

Прадстаўленае даследаванне дзейнасці турыстычнай арганізацыі мінулага выканана з дапамогай агульнанавуковых метадаў (аналіз, сінтэз, абагульненне) і спецыяльных гістарычных (дыяхронны метад, гісторыка-сістэмны, кантэнт-аналіз).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Саюз турыстычнай прапаганды Наваградскага ваяводства (далей – Саюз) пачаў актыўна дзейнічаць з 1935 г. Як адзначаецца ў артыкуле, прысвечаным арганізацыі Наваградскага аддзела Саюза, «да апошняга часу ў краіне турызмам апекаваліся розныя арганізацыі [1]» на валанцёрскіх (не камерцыйных) умовах, што кепска ўплывала на якасць турыстычнага абслугоўвання. Але з 1935 г. па ініцыятыве аддзела турызму Міністэрства камунікацыі пачалі ствараца прынцыпова новыя турыстычныя арганізацыі, якія абапіраліся на моцныя матэрыяльныя грунты, аснова іх – не фізічныя асобы, а інстытуцыі і прадстаўніцтвы, якія зацікаўленыя ў матэрыяльным развіцці рэгіёна. Наваствораныя Саюзы турыстычнай прапаганды мелі за мэту прыцягнуць да свайго раёну як мага больш турыстаў, стварыць самыя лепшыя і карысныя ўмовы для побыту турыстаў, старацца аб паляпшэнні транспартных камунікацый у сваім раёне [1].

З выяўленых на старонках турыстычнага бюлетэня «У Навагрдскім краі» матэрыялаў, датычных арганізацыйнай дзейнасці Саюза, можна вылучыць наступныя аспекты:

1. Арганізацыйная структура і структура кіравання арганізацыі. Цэнтральнае бюро Саюза ў Наваградку размяшчалася па вул. Касцельная 3. Філіялы Саюза знаходзіліся ў Баранавічах (вул. А. Міцкевіча 16; кіраўнік – прафесар Л. Турскі), Слоніме (пры павятовай адміністрацыі; кіраўнік – інжынер А. Сахацкі) і Нясвіжы (пры павятовай адміністрацыі; кіраўнік – інспектар Б. Антчак) [1].

Першапачаткова справамі Саюзу часова кіраваў урад у асобе куратара і дырэктара бюро. 30 сакавіка 1935 года быў скліканы агульны сход усіх чальцоў з мэтай правядзення выбараў кіраўніцтва Саюзу. Пасля сходу была вызначана наступная структура кіравання і размеркаваныя пасады: урад Саюза (Прэзідэнт, I віцэ-прэзідэнт, II віцэ-прэзідэнт, I чалец прэзідыуму, II чалец прэзідыуму, 5 чальцоў ураду, 3 намеснікі чальцоў ураду); рэвізійная камісія (Прэзідэнт, віцэ-прэзідэнт, сакратар), суд Саюза (Прэзідэнт, віцэ-прэзідэнт, сакратар) [2].

2. Рэгіянальная сетка і чальцы арганізацыі. У склад Саюза ўваходзілі:

a) Павятовыя саюзы самакіравання: Наваградскі, Нясвіжскі, Баранавіцкі, Стаўпецкі, Слонімскі і Шчучынскі;

b) Гмінныя органы ўлады: у Міры і Жухавічах (Стаўпецкі павет); Гавезне, Грыцэвічах, Клецку, Лані, Сіняўцы, Снове, Заастравеччы і Гарадзеі (Нясвіжскі павет); Цырыне, Уселюбе,

Гарадзечне, Шчорсах, Кушэлеве, Любчы і Карэлічах (Наваградскі павет); Орлі, Ружанцы, Шчучыне (Шчучынскі павет); Моўчадзі, Дабромыслі, Ляхавічах, Сталовічах і Гарадзішчы (Баранавіцкі павет); Радуні, Белагрудзе, Эйшышках і Беліцы (Лідскі павет); Казлоўшчыне, Сянькоўшчыне, Дзярэчыне, Быцені, Галынцы і Жыровічах (Слонімскі павет).

с) Гарадскія рады: у Баранавічах, Нясвіжы, Клецку, Ляхавічах і Лідзе [1].

Акрамя таго ў якасці чальцоў далучыліся: прамысловая і гандлёвая палата ў Вільне, турыстычнае бюро «Orbis», рэдакцыя газеты «Kurier Wileński», турыстычная камісія віленскай школьнай акругі, рамесная палата ў Наваградку, асацыяцыя ўласнікаў гатэлей у Наваградку, саюз уласнікаў нерухомасці ў Наваградку, гільдыі пекараў, мяснікоў, рэзнікаў і цырульнікаў гораду Наваградка, а таксама розныя фізічныя асобы [2].

3. Напрамкі дзейнасці арганізацыі. Бюро і прадстаўніцтвы Саюза:

- забяспечваюць: усёй турыстычнай інфармацыяй вусна бясплатна, а пісьмова за кампенсацыю паштовых выдаткаў ў памеры 20 грошаў;
- пастаўляюць: гідаў, аўтобусы, экіпажы і конныя павозкі для турыстаў і вандроўнікаў;
- рэкамендуюць прыезджым: гатэлі, рэстараны, кандытарскія і іншыя гандлёвыя ўстановы, а таксама пансіянаты, лецішчы на Наваградчыне;
- забяспечвае: рознай інфармацыяй і практычнымі парадамі, як наведаць паасобныя гарады Наваградскага краю;
- прадае: розныя турыстычныя выданні, такія як: даведнікі, паштоўкі, карты, улёткі і іншыя.
- прымае замовы на: пакоі альбо калектыўны начлег у гатэлях і на базах, супольны сняданак, абеды, вячэры ў рэстаранах і закусачных;
- аказвае любую дапамогу і дае парады тым, хто наведвае Наваградчыну [1].

4. Гадавы бюджэт і планы дзейнасці. Зацвярджэнне бюджэту і праграмы дзейнасці на 1935 г. былі вызначаны на агульным сакавіцкім сходзе. Адзначаецца, што бюджэт Саюзу на 1935 г. прадугледжвае звычайныя выдаткі на турыстычную прапаганду 7 863 злотых [2]. Праграма прац на 1935 г. была наступная:

1) арганізацыя святкавання «Дзён Міцкевіча» з 27 чэрвеня па 5 ліпеня, падчас якіх плануецца: асвячэнне падмурка пад помнік А. Міцкевічу, прадстаўленні на Замку і ўрачыстыя сустрэчы ў Наваградку, конныя спаборніцтвы ў Баранавічах, насып кургана ў гонар памяці Т. Рэйтана ў Ляхавічах і таму падобнае, супольныя аўтамабільныя вандроўкі Нясвіжскім шляхам праз Карэлічы, Турэц, Мір, Нясвіж, Сноў, Сваятычы, Тугановічы, Варончу, Свіцязь, Чомбраў да Налібацкай пушчы на возера Кромань;

2) правядзенне ў Наваградку рэгіянальнай выставы з 29 чэрвеня па жнівень;

3) арганізацыя цягам усяго лета пастаянных аўтобусных вандровак па Наваградскіх маршрутах;

4) распачаць акцыі па высадцы дрэў у гарадах Наваградчыны і таму падобнае [2].

**Заключэнне.** Такім чынам, на грунце матэрыялаў, якія былі апублікаваныя на старонках выдання «У Наваградскім краі», адносна дзейнасці Наваградсгага аддзела Саюза турыстычнай прапаганды можна адзначыць наступнае:

1) Саюз меў складаную і разгалінаваную арганізацыйную структуру, якая складалася з цэнтральнага бюро і трох прадстаўніцтваў. Кіраўніцтва Саюзам ажыццяўлялася досыць вялікім адміністрацыйным апаратам, у які ўваходзіў урад (13 асоб), рэвізійная камісія (3 асобы), суд (3 асобы);

2) Саюз быў досыць шматлікай арганізацыяй. Да турыстычнай справы мелі дачыненне павятовыя саюзы самакіравання, гмінныя органы ўлады, гарадскія рады, а таксама шэраг грамадскіх і гаспадарскіх аб’яднанняў, прыватныя асобы;

3) напрамкі дзейнасці Саюза ахоплівалі шырокі спектр турыстычных паслуг: інфармацыйнае забеспячэнне, браніраванне, рэалізацыя прадукцыі, арганізацыя вандровак і інш.

4) Саюз меў уласны бюджэт і план дзейнасці, якія палягаў у плоскасці арганізацыі разнастайных мерапрыемстваў, у тым ліку – арганізацыю экскурсійнай дзейнасці.

1. W Nowogródzkiej Stronie. – 1935. – №1.
2. W Nowogródzkiej Stronie. – 1935. – №3.